

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Forwarded from Вясна: Палітвязні Беларусі
‼️Больш за 53 500 рублёў спагналі з мінчанкі за «блакіроўку дарог» на двух нядзельных Маршах ў жніўні і верасні 2020 года

У ліпені суд Цэнтральнага раёна асудзіў **Анастасію Тарэлка** і палітвязня Мікалая Шэметава за арганізацыю і актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, што груба парушылі грамадскі парадак падчас нядзельных Маршаў у жніўні і верасні 2020 года. Суддзя Дзмітрый Карсюк пакараў **Анастасію Тарэлка** абмежаваннем волі без накіравання тэрмінам на тры гады, а палітзняволенага **Мікалая Шэметава** — пазбаўленнем волі тэрмінам на два гады. Цяпер з 26-гадовай Анастасіі Тарэлка прадпрыемства «Мінсктранс» праз суд хоча спагнаць грошы за «перакрыццё руху транспарта» адразу на **пяці нядзельных Маршах**, а з Мікалая Шэметава — толькі за Марш 27 верасня.

У судзе Фрунзенскага раёна 21 верасня разглядзелі грамадзянскі пазоў «Мінсктранса» да Анастасіі і Мікалая**.** Агульны пазоў складае **46 043 рублі 8 капеек** — столькі прадпрыемства страціла 27 верасня ад «злачынства» адказнікаў. Але суддзя Фрунзенскага раёна **Аляксей Мігурскі** пастанавіў перадаць справу Тарэлка і Шэметава ў суд Маскоўскага раёна, каб аб'яднаць з астатнімі пратэстоўцамі. Акрамя гэтага, на думку «Мінсктранса», за яшчэ чатыры Маршы Анастасія паспела спыніць транспарт на агульную суму **76 818 рублёў 1 капейку:**
Марш Свабоды, 16 жніўня 2020 — 8 168 рублёў 56 капеек;
Марш новай Беларусі, 23 жніўня — 5 772 рублі 7 капеек;
Марш міру і незалежнасці, 30 жніўня — 9 481 рубель 10 капеек;
Марш Справядлівасці, 20 верасня — 53 396 рублёў 28 капеек.

Групавы пазоў за 16 і 30 жніўня будуць разглядаць у судзе Заводскага раёна ў дачыненні да Тарэлка і іншых асуджаных. А пазоў за 23 жніўня і 20 верасня разглядзелі ўчора, 19 кастрычніка, у судзе Фрунзенскага раёна. Інтарэсы «Мінсктранса» на судзе прадстаўлялі **Святлана Бадзькова** і начальнік кіравання арганізацыі перавозак **Раман Прановіч.** Справу вяла суддзя **Вольга Красоўская** з удзелам пракуроркі **Лізаветы Казловай.**

Згодна з абвінавачваннем, сума «недаатрыманага прыбытку прадпрыемствам» ад дзеянняў Анстасіі Тарэлка 23 жніўня — **5 839 рублёў 65 капеек** за чатыры з паловай гадзіны, а 20 верасня — **47 716 рублёў 7 капеек** за дзве гадзіны і дзесяць хвілін. Агульная сума пазову склала **53 555 рублёў 72 капейкі.**

Прадстаўнікі «Мінсктранса» на судзе прадаставілі дакументы, якія *«ўключаюць у сабе аб'ектыўныя і дакладныя звесткі на аснове атрыманых дадзеных у аўтаматычным рэжыме з адмысловай сістэмы, згодна з якімі, у дадзены перыяд часу сапраўды быў спынены грамадскі транспарт па пэўных маршрутах у следстве незапланаваных мерапрыемстваў»*.

Як сцвярджаюць прадстаўнікі, сума пазову — гэта *«недаатрыманая выгада на аснове аплат за праезд за аналагічны перыяд мінулага году»*. Усе панесеныя страты ў выглядзе недаатрыманай выгады і даходаў за пэўны час, *«прадпрыемства магло атрымаць пры звычайных умовах грамадзянскага абароту, калі б іх права не было парушана ў следстве супрацьпраўных дзеянняў Тарэлка»*. На судзе Анастасія не пагадзілася з пазовам, бо, па яе словах, падчас Маршаў нават не выходзіла на праезную частку.

з назовам, бо, на яе словах, надчас Маршаў нават не выходзіла на праезную частку.

Context

У выніку, 20 кастрычніка суддзя Вольга Красоўская задаволіла пазоў «Мінсктранса» і пастанавіла спагнаць з Анастасіі **53 555 рублёў 72 капейкі.** Таксама Тарэлка павінна сплаціць дзяржпошліну ў памеры **2 677 рублёў 78 капеек.**

Embed

View In Channel

<script async src="https://telegram.org/js/telegram-widget.js?22"

1 at 17:01

Copy